# ЗАЎСЁДЫ Ў ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

У ГЭТУ залу прыходзяць пажылыя і моладзь, рабочыя, калгаснікі, студэнты, вучні. Адны ведалі Сяргея Осіпавіча па сумеснай рэвалюцыйнай барацьбе ў суровыя гады падполля, многія працавалі разам з ім у першыя пасляваенныя гады, падымалі з руін і папялішчаў Гродзеншчыну. Для юнакоў і дзяўчат ён любімы герой кніг і кінафільма, чалавек, з якога можна рабіць жыццё.

Перад уваходам — вялікі партрэт С. О. Прытыцкага, выкананы, відаць, у апошнія гады яго жыцця. Пасівелыя скроні, пранікнёны позірк задумлівых вачэй і шчырая ўсмешка. Такім назаўсёды застанецца ў нашай памяці гэты выдатны рэвалюцыянер, таленавіты партыйны і дзяржаўны дзеяч, мужны, прыветлівы і добры чалавек.

...На адным са стэндаў — бедная сялянская хата. Замшэлая страха, счарнелыя, патрэсканыя бярвенні, падслепаватыя акенцы. Мастакам давялося нямала папрацаваць, каб стварыць дакладны макет — падобных будынін у сучаснай беларускай вёсцы знайсці не ўдалося. Але ў такой вось хаціне, што стаяла ў вёсцы Гаркавічы, непадалёку ад Гродна, і нарадзіўся ў 1913 годзе С. О. Прытыцкі.

Дзяцінства... Яго амаль што і не было. Як сябе памятаў — пасвіў кароў у мясцовых багацеяў. З ранняй вясны і да позняй восені. А калі падужэў — за касу ўзяўся, за цэп. Гэта ўлетку і ўвосень. А зімой — з ранку да позняга вечара гібеў на панскіх лесасеках. З дня ў дзень, з году ў год. Як дзяды, як бацькі.

Да якога часу трываць у галечы, цемры і невуцтве? Над гэтым усё часцей і часцей задумваўся юнак Прытыцкі. Выйсце падказаў старэйшы брат Аляксандр — камуніст з 1923 года. Лепшую долю можна заваяваць у рашучай барацьбе, так, як заваявалі не рускія браты ў 1917 годзе. З рук старэйшага брата атрымаў першую падпольную кніжку, уважліва чытаў і перачытваў кожную старонку. Гэта былі творы У. І. Леніна. Гэта былі кнігі, якія вучылі жыць і змагацца, сталі сапраўдным промнем святла ў цемры ночы.

У 1930 годзе ён уступіў у рады камсамола Заходняй Беларусі, а праз два гады стаў камуністам, сакратаром Гродзенскага падпольнага акруговага камітэта камсамола.

Дзесяткі, сотні кіламетраў прайшоў ён па хутарах і вёсках Гродзеншчыны. Там, дзе з'яўляўся мужны рэвалюцыянер, на барацьбу за светлую будучыню ўзнімаліся новыя і новыя барацьбіты, ствараліся падпольныя ячэйкі партыі і камсамола. Гродзенскі мастак Д. М. Парахня стварыў цікавы партрэт Прытыцкага таго часу, які ўдала дапаўняе экспазіцыю... У накінутым на плечы кажушку сядзіць юнак ля газнічкі. Твар яго натхнёны і рашучы. Заўтра, відаць, у маладога рэвалюцыянера сустрэчы з тымі, хто чакае палымянай праўды партыі...

Небяспечным і складаным быў шлях, на які ступіў Прытыцкі. На кожным кроку яго падсцерагалі нечаканасці, цяжкія выпрабаванні, якія мог перанесці не кожны. Што гэта было так, сведчаць дакументы экспазіцыі. Яго ўпершыню арыштавалі 9 чэрвеня 1933 года непадалёку ад Гродна, у вёсцы Азёры. Першы допыт быў у мясцовым «пастарунку», а потым — у гродзенскай турме. Пры дапамозе кулакоў і дубінак ад яго дабіваліся адрасоў явак, расшыфроўкі псеўданімаў падпольшчыкаў. Але рэвалюцыянер трымаўся цвёрда і непахісна. Не атрымаўшы жаданых вынікаў, Прытыцкага без усялякага суда і следства кінулі за краты турмы. А ва ўсе канцы Гродзеншчыны паляцелі запатрабаванні да паліцыі і тайных агентаў — знайсці неабходныя для следства і суда матэрыялы, а галоўнае — «надзейных» сведкаў. Уся гэта перапіска захавалася, яна часткова дэманструецца ў зале. З яе відаць, што ніякіх «важкіх» доказаў паліцыі знайсці не ўдалося, і Прытыцкага пасля пяцімесячнага зняволення ўлады вымушаны былі выпусціць на свабоду.

Асобны раздзел экспазіцыі прысвечаны таму, як было выканана рашэнне КПЗБ аб ліквідацыі правакатара Стральчука. На сумленні гэтага здрадніка было нямала членаў партыі і камсамольцаў, якіх ён выдаў паліцыі. Больш таго, на шматлікіх палітычных працэсах Стральчук выступаў як асноўны сведка абвінавачвання. Яго «паказанні» выкарыстоўваліся для таго, каб зняславіць многіх барацьбітоў за свабоду і кінуць іх за краты на доўгія гады.

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*

**В. ІВАНОЎСКІ,**
**кар. «Звязды».**



НА ЗДЫМКУ: у мемарыяльнай зале С. О. Прытыцкага Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.
Фота А. Перахода. (БЕЛТА).

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь